кошт
30 кап.

ГОД ЗАСНАВАНЬНЯ
1902
ВЫХОДЗІЦЬ
З 1990

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

# СВА

**1990**
**СЬНЕЖАНЬ**
**5**
СЕРАДА

**ЧАРНОБЫЛЬ — АВАРЫЯ ДЛЯ МАСКІРОЎКІ.** *Хто і навошта ўзарваў чацьверты блёк АЭС? — пра гэта ў СВАБОДУ напісаў народны дэпутат з Пінску А.Дуброўскі.* 1

**СЛУЦКАЯ ВАЙНА.** *Артыкул Вітаўта Кіпеля (ЗША) пра ўзброенае змаганьне з бальшавікамі на Беларусі у 1920—1934 гадох.* 2-3

**ЛЕНІН ЯШЧЭ ВІСІЦЬ** *альбо Антыімпэрыялістычная салідарнасьць у былой ГДР.* 4

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ:

**СТАТЫСТЫКА.** *Чаго хоча і чаго ня хоча беларускі народ?*

**"ГІДРА НЯ СЬПІЦЬ!** *Вашыя дзеці могуць апынуцца ў ейным чэраве! — кажа кандыдат у дэпутаты Менскага гарсавету Рыгор Куксаў.*

Выдаецца на беларускай мове Янкі Купалы, Максіма Гарэцкага, Антона Луцкевіча без уліку пастановы СНК БССР ад 1933 году.

Дасланыя матэрыялы рэдакцыя не рэцэнзуе і не вяртае.

Думка аўтараў не абавязкова супадае зь меркаваньнем рэдакцыі.

Выпускаецца штотыднёва (затрымкі — вымушаныя) з 1990 г.

СВАБОДА—пакуль адзіная беларуская апазіцыйная газэта. Атрымаць СВАБОДУ Вы можаце, калі накіруеце адвольную суму грошай (зь якой пасьля будзе вылічвацца кошт кожнага дасланага Вам нумару) паштовым пераказам на адрас: 220045, Менск, п/с 17, Сп. Сабаленку Алесю Міхайлавічу.

Для падпіскі праз Саюздрук наш індэкс: 63887.Кошт на падпіску: на 1 месяц—1 руб.,на 3 месяцы—3 руб.,на паўгады—6 рублёў.

Адрас для карэспандэнцыі: 220045, Менск,п/с 17, Сп. Сабаленку Алесю Міхайлавічу.



**ХТО КАГО БІЎ, ХТО ТАПТАЎСЯ ПА КВЕТКАХ, ХТО ПАРУШЫЎ ЗАКОН, ХТО ЎЧЫНІЎ АКТ ВАНДАЛІЗМУ? ШТО АДБЫЛОСЯ Ў МЕНСКУ НА ПЛОШЧЫ КАЛЯ ДОМУ ЎРАДУ 7 ЛІСТАПАДА? ПРА ГЭТА СВАБОДЗЕ РАСПАВЁЎ УДЗЕЛЬНІК КАНФЛІКТУ САКРАТАР УПРАВЫ БНФ ВІНЦУК ВЯЧОРКА:**



## ЧАРНОБЫЛЬСКІ ВЫБУХ — АВАРЫЯ ДЛЯ МАСКІРОЎКІ

З Чарнобылем ня ўс
проста, — даводзіць наш
галоўны спэцыяліст "П
сегіправадгасу" па
прыроды, дэпутат Пін
гарсавету А.Дуброўскі.
Ен спасылаецца на
"Глабальныя выпадзены
зія 137 і чалавек", у
расьпісаныя сёньняшні
роўні радыяактыўнага з
джаньня раёнаў Беларус
паказаньні супадаюць з
нымі сёньняшніх зам
Вось толькі выйшла наз
кніга ў Маскве ў 1974 г
Значыць, пра чарно
скую катастрофу ведалі
18 гадоў назад?
Справа ў тым, што мы
вем пад радыяактыў
ападкамі з 1950—60 г
Пра што сьведчаць мас
захворваньні людзей н
лесьсі і замеры радыяц
катастрофы.
Гэтая інфармацыя дз
чы перабудове і публічна
ужо пачынала прасоч
з-пад грыфу "Соверш
секретно", яшчэ трохі,

# BODA

№ 13

тэлефакс (0172) 72–69–37


стала б набыткам грамадзкасьці, выклікала б хвалю людзкога абурэньня. І вось тады якраз, у красавіку 1986 году, выбухнуў Чарнобыль. Яшчэ на некалькі гадоў усялякая інфармацыя пра радыянукліды была засакрэчаная.

А.Дуброўскі прыводзіць зьвесткі пра дынаміку захворваньня лейкозамі людзей у Гомельскай вобласьці: 1983 год — 26 чалавек, 1984 — 35, 1985 — 20, 1986 — 30, 1987 — 29, 1988 — 29...

Ўсе заявы кіраўніцтва рэспублікі пра няведаньне сітуацыі, пра ўнікальнасьць аварыі, пра адсутнасьць рэкамэндацыяў па прафілактыцы — гэта хлусьня. Яшчэ да 1974 году выйшлі ў сьвет сотні навуковых распрацовак па гэтым пытаньні, у тым ліку — па вядзеньні сельскай гаспадаркі на забруджаных тэрыторыях.

Чарнобыльскі цэзій заняў сваё мейсца ў нашай зямлі. Але ўсё новы і новы радыяцыйны попел цярушыцца на нашыя галовы сёньня гэтак сама, як і пяць, і дзесяць, і дваццаць гадоў назад. Гэты пыл — вынік дзейнасьці Міністэрства абароны СССР, — сканчае свой артыкул А.Дуброўскі.



## што адбылося на плошчы

— Дзякуючы сродкам масавае інфармацыі, усім добра вядома, што 7 лістапада ў Менску на пляцы каля Дома ўраду адбыліся два мітынгі, дзьве дэманстрацыі і адзін вайсковы парад.
Аднак многія ня ведаюць, што былі ў горадзе спробы адзначыць гэты дзень мірна, не праводзіць ніякіх акцыяў.
Такую пазыцыю падтрымаў Фронт.
Калі б камуністы не праводзілі сваіх акцыяў, адмовіліся б, у сваю чаргу, і мы.
Праўда, быў яшчэ адзін чыньнік — намёт, у якім сядзелі двое сялянаў, якія патрабавалі зямлі і пагражалі самаспаленьнем у выпадку параду. Трэба было думаць і пра гэта.

Прыйшоўшы на пляц, мы не чакалі, што дзень гэты можа скончыцца нейкімі сутычкамі, абвастрэньнем адносінаў зь міліцыяй, якая, мне падаецца, і сама ня радая, што стала цацкай у чужых руках.
Я ўпэўнены, што гэтым людзям у шынялях даўно хочацца займацца сваёй непасрэднай справай, а ня быць прыладаю ў руках цэкакапэбэшнікаў.
Што ж адбылося?
Акрамя шматлікіх лёзунгаў і плякатаў, у руках удзельнікаў дэманстрацыі і мітынгу былі "падарункі" Леніну.
З кожнай эпохай разьвітваюцца ў некалькі этапаў. І адзін з такіх этапаў — трагікамічнае, тэатралізаванае асэнсаваньне той эпохі.
Нашыя "дарункі" чорнай статуі, якая стаіць на галоўным нашым пляцы, — гэта якраз і ёсьць спроба трагікамічнае тэатралізацыі эпохі.
Пудзіла энкавэдзіста, шыбеніца з тэкстам: "Сацыялістычны выбар нашага народу", расьпятае на чырвонай зорцы цела гулагаўскага вязьня і гэтак далей.
Але міліцыя на той дзень атрымала жорсткі загад нікога да помніка не пускаць.

Зянон Пазьняк некалькі разоў праз узмацняльнікі зьвяртаўся да кіраўнікоў міліцыі з прозьбаю прапусьціць дэпутацыю да помніка. Я сказаў "дэпутацыю", таму што ў склад гэтай групы ўваходзілі народныя дэпутаты БССР і гораду.

Міліцыя не адрэагавала і не магла адрэагаваць, бо мела зусім іншы загад.
Між іншым, З.Пазьняк у сваёй прамове перад ускладаньнем "дарункаў" сказаў, што мы ня той народ, які апускаецца да вандалізму, і што "ўшанаваньне" будзе сымбалічнае.
Але група дэпутатаў не была дапушчаная, і народ стыхійна пасунуўся наперад.
Міліцыя, што стаяла па флянгах, даволі хутка прапусьціла людзей, але сьпецназаўскія часткі, што атачалі помнік у "карэ", стаялі мурам і толькі адступалі перад натоўпам.
Адступаючы, яны і патапталі ўсе кветкі.
Пра гэта сьведчаць фотаздымкі і відэазапісы.
Калі людзі патрапілі да помніка, здавалася, што сэнсу "абараняць" яго ўжо няма. Людзі прарваліся, і адразу ж энтузіязм натоўпу зьнік.
Тым ня менш, сьпецназаўцы працягвалі чыніць гэтую куламесу штурхаць народ, выкарыстоўваючы вядомыя ім прыёмы рукапашнае барацьбы.
Відэастужка, на якой храналягічна запісаныя ўсе падзеі на пляцы каля Дому ўраду 7 лістапада, выразна дэманструе, што тады, калі народ супакоіўся, шыхты сьпецназаўскіх частак і часткова міліцыі раптам пасталі "сьвіньнёй", клінам ды рушылі на гэты народ, па дарозе захопліваючы людзей, правакуючы натоўп на новую сутычку.

Менавіта гэтую справакаваную сутычку бачылі тэлеглядачы па тэлевізары.
Што можна сказаць па сьлядох падзей?..
Ня першую паклёпніцкую кампанію мы пераживаем і ня першую шчасьліва пераживем.
Але ўсё ж непакоіць тое, што мы недастаткова працуем у глыбіню.
На мітынг сабраць шмат народу сёньня дастаткова проста.

Калі бальшавікі сабралі на сваю дэманстрацыю тысячы дзьве-тры людзей, якіх прывезьлі на аўтобусах, дык мы сабралі ад 20 да 40 тысячаў. Гэта, безумоўна, пра нешта сьведчыць, але я не аптыміст і не хачу, каб зараз пайшла "мілітарызацыя" Фронту.
Нам вельмі важна захоўваць наш інтэлектуальны пошук і культурна-творчы патэнцыял.
І мне здаецца, што наступны пэрыяд у нас павінен быць пэрыядам вельмі канструктыўнае працы.
Нарэшце, я хачу адказаць тым людзям, якія зазначаюць, што Ленін — гэта наша гісторыя.
Слушна, я з гэтым згодны, але давайце падумаем.
У гісторыі Беларусі былі чатыры гады гітлераўскае акупацыі.
І тады помнікі тут стаялі.
Цяпер іх няма.
Быў пэрыяд сталінізму.
Што, гэта хіба не кавалак нашае гісторыі?
І тады тут стаялі помнікі...
І іх цяперака няма...

Было напалеонаўскае нашэсьце. Зноў жа, значны кавалак гісторыі Беларусі.
Давайце, мяркую, сыходзіць усё ж такі вось з чаго.
Ёсьць наша гісторыя, а ёсьць гісторыя суседніх дзяржаваў.
Давайце, нарэшце, разумець, што як Гітлер, як Сталін, як Напалеон, так і Ленін — гэта ўсё прадстаўнікі каляніяльных імпэрыяў, задачай якіх было захапленьне як мага большай прасторы.



# СЛУЦКАЯ ВАЙНА





# ВІТАЎТ КІПЕЛЬ

(ЗША)

Абвясьціўшы сваю незалежнасьць 25 сакавіка 1918 году, Беларусь была адной з першых нацыяў, перад якімі ў тым самым годзе ўзьнікла пагроза новае акупацыі савецкім рэжымам. Савецкі аўтар А.Г.Хахлоў у сваёй працы пра антысавецкае супраціўленьне на Беларусі сьцьвярджае, што ўзброенае супраціўленьне Саветам пачалося на Беларусі ўвесну 1918 году.

У архівах Беларускага інстытута Навукі й Мастацтва ў Новым Ёрку захоўваюцца шматлікія тэчкі дакумантаў ды распрацоўкаў, сабраных і сыстэматызаваных беларускім гісторыкам і пісьменьнікам нябожчыкам Юркам Віцьбічам, якія пераканаўча сьведчаць, што пачатак антысавецкага супраціву на Беларусі датуецца другой паловай 1918 году. Сам Сп. Віцьбіч зрабіў вялікае дасьледваньне па адным з першых антысавецкіх паўстаньняў у паўночна-ўсходняй Беларусі, у раёне места Вяліж, якое адбылося ў лістападзе 1918 году.

Вышэй згаданыя крыніцы сьведчаць пра тое, што наступныя дзесяць гадоў паўстаньні на Беларусі працягваліся і ўзмацняліся, і што на адным са сходаў Рэвалюцыйнага Камітэту ў Менску ў сакавіку 1919 году вядучы лідар Камуністычнае партыі падсумаваў гэтую праблему такім чынам: "Вайсковыя сілы, накіраваныя на нас звонку, зусім нас не палохаюць. Але мы павінныя засяродзіць нашую ўвагу на ўзброеным супраціўленьні, якое пагражае знутры краіны, таму звышважна для нас павярнуць усю нашую энэргію на барацьбу з унутранай контррэвалюцыяй". Той самы аўтар далей цьвердзіць, што беларускія нацыяналісты, а сярод іх І.Чарапук, адыгралі пэўную ролю ў падрыхтоўцы гэтых паўстаньняў.

Відочна, многія з гэтых антысавецкіх акцыяў былі невялікія, лякальныя й нядоўгія. Але былі й такія, што ўяўлялі сабой паважныя вайсковыя дзеяньні на працягу пэўнага часу. Такою была сэрыя вайсковых кампаніяў пад кіраўніцтвам генэрала Булака-Балаховіча (1918–1921) ды дзейнасьць, узначаленая Б.Савінкавым (1920–1921).

Некаторыя антысавецкія акцыі на Беларусі сталі вядомыя таму, што па складзе былі інтэрнацыянальныя. Людзі розных нацыянальнасьцяў злучаліся ў агульнай мэце змаганьня супраць новънароджанага таталітарнага бальшавізму. Сучасныя аўтары апісваюць адно з такіх антыбальшавіцкіх супольных намаганьняў наступным чынам "У сакавіку 1919 году збунтавалася брыгада Чырвонае арміі, якую паслалі на Беларусь. Паўстанцы ўзялі Гомель і Рэчыцу. Брыгада пераважна складалася з жаўнераў - сялянаў з Тулы, якія аб'ядналіся зь мясцовым паўстанцкім камітэтам Палесься, што прадстаўляў беларускіх сялянаў"

Памеры антысавецкае дзейнасьці на Беларусі за час з 1920 па 1930 гады задакументаваныя ў шматлікіх публікацыях, і дзейнасьць гэтая паставіла перад урадам савецкае Беларусі сур'ёзныя праблемы.

Вынік антысавецкага супраціву на Беларусі ў першыя дзесяцігодзьдзі савецкага рэжыму падводзіцца ў амэрыканскай публікацыі:

"У шэрагу ўзброеных паўстаньняў у 1920–1929 гадох, у сталым пасыўным супраціўленьні ды ў актах сабатажу абуджаная беларуская нацыя выказвала сваю рэакцыю да Масквы... У 1924 годзе афіцыйная камуністычная крыніца паведаміла пра існаваньне 40 беларускіх бандаў. Гэта, паводле савецкай тэрмінапёгіі, значыць — беларускіх партызанскіх атрадаў. Паводле сьведчаньняў мясцовага насельніцтва, апошні партызанскі атрад зьнік каля Дукора Рудзенска ў 1929 годзе. У 1934 годзе пачалося яшчэ адно паўстаньне ў Вяліжы, якое хутка было ліквідаванае. 27 студзеня 1934 году ў тым самым месьце камуністамі было забіта 316 партызанаў атрада "Белая Сьвітка".

Сярод сотняў антысавецкіх паўстаньняў на Беларусі самым вялікім па колькасьці ўдзельнікаў і працяглосьці барацьбы быў Слуцкі вайсковы эпізод.

Слуцкая вайсковая акцыя супраць савецкае Расеі звычайна завецца беларусамі "Слуцкім паўстаньнем". Аднак апошнім часам уздымаюцца галасы, якія ставяць пад запытаньнем адпаведнасьць гэтага тэрміну. Галоўны аргумант супраць выкарыстаньня тэрміну "паўстаньне" наступны: Случчына не прызнала Савецкі рэвалюцыйны ўрад як урад Беларусі. Заміж таго Слуцкая адміністрацыя прызнала Ўрад Беларускае Народнае Рэспублікі (у стварэньні якога Случчына актыўна ўдзельнічала). Слуцкае кіраўніцтва ўважала Чырвоную армію за захопнікаў, якія не прадстаўляюць ніякага законнага ўраду. Таму зараз беларусы заміж "Слуцкага паўстаньня" карыстаюцца тэрмінам "Слуцкі Фронт" Беларускае Народнае Рэспублікі.

Гэтая антысавецкая вайсковая акцыя пачалася ў лістападзе 1920 году і праходзіла пад штандарам БНР. Сярод кіраўнікоў Слуцкага паўстаньня шмат было тых, хто быў ініцыятарам скліканьня Ўсебеларускага Зьезду, хто ўвайшоў у Выканаўчую Раду БНР, хто браў актыўны ўдзел у плянаваньні ды падрыхтоўцы гэтае вайсковае чыннасьці. Слуцкі канфлікт трэба разглядаць як працяг руху за аднаўленьне беларускае незалежнасьці.

Места Слуцак знаходзіцца ў цэнтральнай Беларусі, каля 70 міляў на поўдзень ад сталіцы. Места існуе ад 12 стагодзьдзя і заўжды было актыўнае ва ўнутранай палітыцы Беларускае дзяржавы. Гэтае места таксама вядомае, як інтэлектуальны цэнтар: яно карысталася добрай рэпутацыяй за свае выбітныя школы, друк і актыўныя рэлігійныя аб'яднаньні. Паясы, вырабленыя ў Слуцку, шырока вядомыя і для знаўцаў уяўляюць сапраўдную каштоўнасьць. У адрозьненьне ад іншых рэгіёнаў Беларусі, русіфікацыя не закранула Слуцак у такой ступені, і людзі яшчэ захавалі пачуцьцё беларускае этнічнае асаблівасьці.

Места і раён Слуцка сталі важным цэнтрам беларускага палітычнага адраджэньня пасьля Лютаўскае рэвалюцыі. Гэта было першае места на Беларусі, дзе адкрылася беларуская сярэдняя школа. У Слуцку сабралася беларуская адміністрацыя, якая актыўна ўдзельнічала ў абраньні дэлегатаў з усяе Случчыны на Ўсебеларускі Зьезд у сьнежні 1917 году ў Менску. Беларуская адміністрацыя захавала свой статус у раёне падчас польскае й нямецкае акупацыяў, хоць з польскімі акупантамі хутка ўзьніклі непаразуменьні па розных пытаньнях. Палякі афіцыйна абвясьцілі, што яны вітаюць супрацоўніцтва зь беларусамі, але на справе ўсё было наадварот. Адзін з дакумантаў польска-беларускіх дачыненьняў сьведчыць, што палякі хацелі замяніць беларускую адміністрацыю сваёй уласнай ці "беларускай па форме, але польскай па зьмесьце". Гэты дакумант даводзіць: "Наша першачарговая задача — распусьціць Раду Беларускае Народнае Рэспублікі і Беларускі Ўрад. Заміж таго мы павінныя стварыць пашыраны Беларускі Камітэт". Гэткія адносіны палякаў, безумоўна, выклікалі адмоўнае стаўленьне насельніцтва, і на Случчыне (як і на ўсей акупаванай тэрыторыі) доўгі час адбываліся антыпольскія сутыкненьні. Падзеі на фроньце былі ня надта спрыяльныя для палякаў, і ў выніку бальшавіцкае перавагі, палякі ў 1920 годзе пачалі адыходзіць зь беларускіх тэрыторыяў. Хоць былі там палякі хоць не, але яны не зрабілі вялікага ўплыву на беларускую адміністрацыю Случчыны: беларусы дзейнічалі там па-ранейшаму, як і некалькі гадоў дагэтуль.

Савецкія войскі сутыкнуліся з раптоўнаю праблемай: беларуская адміністрацыя не прызнала саветы, як законную сілу. Напружаньне ўзмацнілася, калі саветы паспрабавалі арганізаваць уласныя адміністрацыйныя камітэты. Слуцкая адміністрацыя й міліцыя супрацьдзейнічалі та-



му кроку. Савецкія камандзіры разумелі, што ім спатрэбіцца болей сілаў, каб зламіць супраціўленьне. Па прозьбе савецкіх актывістаў раёну бальшавікі, якія знаходзіліся ў Менску з 11 ліпеня 1920 году, запатрабавалі, каб камуністычная партыя накіравала вайсковую падтрымку з раёнаў Масквы і Петраграду ў Слуцак. Становішча на Случчыне пагоршылася, калі саветы пачалі набіраць сваіх прасавецкіх дэлегатаў ад раёну на савецкую канфэрэнцыю, што мелася адбыцца ў Менску ў сьнежні. У адказ на савецкія захады 14 лістапада 1920 году беларуская адміністрацыя Случчыны склікала ўласны сход. Кіраўніцтва запрасіла на гэты сход прадстаўнікоў Беларускага Ўраду. Зьездаўскія нарады цягнуліся два дні. Зьезд Случчыны стаў моцным, выразным голасам у падтрымку беларускае адміністрацыі, у падтрымку Беларускага Ўраду, які случакі ўважалі за адзіны законны Ўрад Беларусі. Слуцкі зьезд ухваліў наступную рэзалюцыю:

"Першы Зьезд Случчыны, які сабраўся 14–15 лістапада 1920 году і складаецца са 107 дэлегатаў, вітае Галоўную Раду Беларускае Народнае Рэспублікі і запэўнівае, што Случчына пакладзе ўсе намаганьні на адраджэньне Бацькаўшчыны. Дэлегаты Слуцкага Зьезду катэгарычна пратэстуюць супраць акупацыі краіны замежнымі, самазванымі савецкімі ўладамі. Жыве вольная й незалежная Беларуская Народная Рэспубліка ў яе этнаграфічных межах! Жыве Беларуская Армія і брацтва славянскіх народаў! Мы вітаем таксама нашу сястру Польшчу. Жыве Ўстаноўчы Беларускі Ўрад!"

Рада Случчыны заклікала заходнія дэмакратычныя краіны надтрымаць Беларускую Народную Рэспубліку, каб запабегчы падзелу Беларусі.

Зьезд 14–15 лістапада абраў Раду Случчыны, якая стала прадстаўнічай управаю раёну. Рада выказала поўную падтрымку і лаяльнасьць да Ураду БНР і абрала афіцэраў дзеля сувязі. Фактычна Слуцкая рэгіянальная Рада мела сталага прадстаўніка Ўраду БНР. Як толькі скончыўся Зьезд, Слуцкая Рада адразу пачала ствараць міліцыю Случчыны і абвясьціла набор для фармаваньня рэгулярных вайсковых атрадаў. За параўнальна кароткі адцінак часу, у межах некалькіх тыдняў, Рада здолела рэкрутаваць каля 10 тысячаў чалавек і заснаваць Слуцкую Брыгаду з харугвамі у мястэчках Семежава і Грозава. Драбнейшыя вайсковыя аддзелы былі сфармаваныя ў вёсках Быстрыца, Верабейцы, Васілічы і некаторых іншых. Прадстаўнікі Рады Случчыны былі актыўныя ў Польшчы і іншых заходне-эўрапэйскіх краінах, хадайнічалі аб вайсковай дапамозе.

28 лістапада 1920 году Слуцкая Брыгада атрымала блаславеньне праваслаўнае царквы і ўсе вайсковыя аддзелы занялі баявыя пазыцыі.

Першае вайсковае выступленьне і сутычка з бальшавікамі адбыліся 27 лістапада 1920 году: пачаліся баі ў шматлікіх мясцовасьцях. Хутка пасьля гэтага беларускія атрады выгналі камуністаў са Слуцку і вызвалілі шмат вёсак з-пад савецкага кантролю.

Страты былі цяжкія з абодвух бакоў. Хоць беларусы атрымалі шэраг перамогаў, савецкая перавага ў рыштунку і жывой сіле прывяла да сур'ёзных стратаў. У хуткім часе беларускія афіцэры паведамлялі, што ім бракуе рыштунку. Дапамога, на жаль, не прыходзіла.

Слуцкія вайсковыя аддзелы пачалі адыходзіць на захад пасьля пацёх тыдняў барацьбы. 31 сьнежня 1920 году апошні беларускі вайсковы атрад перасек мяжу Польшчы і Савецкай Расеі. Тысячы беларускіх жаўнераў пайшлі на захад. Лёс іхні быў розны: некаторыя засталіся ў Польшчы, некаторыя трапілі ў Францыю, а многія апынуліся ў Злучаных Штатах.

Каб мець больш выразнае ўяўленьне пра адлеглую падзею, што адбылася на Случчыне ў 1920 годзе, варта прачытаць урывак з кароткіх успамінаў Хведара Данілюка, які ў той час быў маладым афіцэрам Беларускае Арміі і ўдзельнікам Слуцкае акцыі. Пазьней праялебны Хведар Данілюк быў першым пастарам (пакуль не памёр у 1960 годзе) першае парафіі Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ў Новым Ёрку. Вось ягоныя ўспаміны:

"Увосень 1920 году я знаходзіўся ў дыспазыцыі Беларускага камандаваньня ў Горадні. У лістападзе таго ж году я атрымаў загад накіравацца ў мястэчка Семежава разам з маёрам Якубецкім. Мы выправіліся ў дарогу на возе і амаль што праз тыдзень прыехалі ў Семежава. У Семежаве мы пайшлі проста ў Штаб Брыгады, які месьціўся ў парафіяльным доме. Мяне прызначылі камандзірам падрыхтоўчага аддзяленьня малодшых афіцэраў. Маёр Якубецкі паехаў назад у Горадню. Камандзірам брыгады тады быў харунжы Гаўрыловіч, які пазьней, з прычыны стану здароўя, перадаў кіраўніцтва брыгадаю капітану Сокалу-Кутылоўскаму. Брыгада складалася зь дзьвюх харугваў: Першае харугвы слуцкіх мушкецёраў і Грозаўскае харугвы. Камандзірам першага аддзелу спачатку быў капітан Сокал-Кутылоўскі, першым намесьнікам быў лейтэнант Міранові і ад'ютантлейтэнантам Арцішэўскі. Я ня памятаю, хто замясьціў капітана Сокала-Кутылоўскага. Камандзірам Грозаўскае харугвы быў капітан Семянюк, а яго першым намесьнікам капітан Гнароўскі. Штабы абедзьвюх харугваў месьціліся ў школьным будынку. Жаўнеры кватараваліся ў прыватных дамох. Харчаваліся яны на вайсковых кухнях, а ежа добраахвотна пастаўлялася з розных мястэчкаў. Па маіх падліках у брыгадзе было прыблізна 4000 чалавек. Усе афіцэры насілі ўніформы пераважна былое Расейскае арміі. Забесьпячэньне жаўнераў уніформаю ўяўляла пэўную праблему. Аднак ва ўсіх на каптуры быў знак Пагоні, а афіцэры насілі знак Пагоні яшчэ і на каўнярах. Цяжкое становішча было са зброяй. Ня кожны жаўнер меў стрэльбу, а іншую зброю і патагоў. Брыгада заставалася ў Семежаве каля трох тыдняў. Увесь гэты час харугвы вартавалі навакольную мясцовасьць і змагаліся з мацнейшымі бальшавіцкімі аддзеламі паблізу Цімкавічаў, Грозава ды іншых месцаў, назовы якіх я ня памятаю.

Лейтэнанта Міpановіча паранілі ў адным з гэтых баёў. У дадатак былі страты сярод жаўнераў, якіх пахавалі побач з царквою ў мястэчку Семежава.

Камандзір групы выведкі — на жаль, ня памятаю імя — вельмі часта хадзіў у выведку. Ён глыбока праходзіў у тыл занятай тэрыторыі і часта захопліваў шмат палонных. Калі палонныя былі беларусы, яны звычайна далучаліся да брыгады; а калі былі не беларусы — іх адпускалі.

Іншыя афіцэры брыгады, якіх я памятаю, гэта лейтэнанты Гвасеня, Капец, Янкоўскі, Кітовіч, Казека, Дутка і малодшыя лейтэнанты Рудзік і Сегідзвіч. Брыгада была вымушаная адыйсьці пад націскам бальшавіцкіх сілаў — спачатку ў мястэчка Грыцавічы і пазьней за раку Лань, праз мяжу на польскую тэрыторыю. Падрыхтоўчы аддзел брыгады, якім камандаваў я, быў незалежнаю, асобнаю ад харугвы групаю. Маім першым намесьнікам быў лейтэнант Падгурскі. Аддзел налічваў 130 кадэтаў, маладых людзей, амаль кожны з каторых меў вышэйшую адукацыю. Фактычна гэты гурт меўся стаць стрыжнем Афіцэрскае Школы. Кадэты ня ўдзельнічалі ў баёх. Наша група, як і іншыя аддзелы ў складзе брыгады, адчувала брак зброі. Калі адыходзіла брыгада, мой падрыхтоўчы аддзел таксама адыйшоў — спачатку ў вёску Піліпавічы, затым у Грыцавічы і нарэшце ў вёску Чапру. У Чапры я атрымаў загад перавесьці аддзел у места Подзь у Польшчу,дзе разьмясьціўся беларускі батальён. Я так і зрабіў".



# УСЁ ПРА ЎСЁ

**Незалежная беларуская друкарня К.Пянткоўскага.**

**Вы зьбіраецеся выдаць зборнік вершаў? Вы ня ведаеце, якому выдавецтву даверыць ВАШ рукапіс? Раім зьвярнуцца да Незалежнай друкарні К.Пянткоўскага.**

**Адрас:220018, Менск,а/с 155. Даведкі па тэл.51-14-52/Алесь/**

## *"ВОЗМУЩЕНИЮ НЕТ ПРЕДЕЛА"*

**Такі пафас сустракаем на старонках пінскай партыйнай газэты "Полесская правда":**

**"Неожиданная весть взволновала наш город, болью отозвалась в сердце каждого честного пинчанина. Неизвестные лица воровски, под покровом ночи осквернили памятник Владимиру Ильичу Ленину. — заяўляе гарадзкі савет ветэранаў. — До этого в городе зарегистрированы факты надругательства над бюстами знатных людей нашего государства: Ф.Э.Дзержинского, С.М.Кирова, В.З.Хоружей..."**

**Падрабязнасьці апошняга інцыдэнту знаходзім у пінскай савецкай газэце "Пінскі веснік":**

**"В ночь с 17 на 18 ноября чья-то злая рука бросила стеклянную банку с белой краской в бронзовый силуэт... Жутко было видеть испачканный памятник. — піша нехта Ф.Сыцін. — От разрушения памятников, храмов, дворцов, к чему приложил когда-то руку и сам Владимир Ильич, дело дошло до уничтожения миллионов людей. Так что же, надо пойти всем нам по новому страшному кругу несчастий?"**

**Сёньня СВАБОДА атрымлівае шмат допісаў зь Беларусі ды зь іншых краінаў.**

**Кожны чалавек можа стаць нашым аўтарам, калі паведаміць штосьць цікавае ды карыснае з жыцьця свайго пасялішча—вёскі, места ці краіны, альбо падзеліцца ўласнымі думкамі пра сваё і нашае жыцьцё-быцьцё.Гэткі матэрыял адразу трапіць на старонкі СВАБОДЫ.Пішыце, калі ласка.**

**СВАБОДА**

## НАД РАДАШКАВІЧАМІ БЕЛАРУСКІ СЬЦЯГ

*Сэсія мясцовага пасялковага Савету пастанавіла карыстацца бел-чырвона-белым сьцягам і гэрбам Пагоня. Нацыянальнымі сымбалямі могуць карыстацца ўсе установы, прадпрыемствы, арганізацыі і асобныя грамадзяне.*

*М.ЛІНЬНІК.*

## "ЛЕНІН ЯШЧЭ ВІСІЦЬ"

(паводле "Newsweek")

Пры наведваньні гімназіі імя Леніна ў сталіцы былой ГДР узьнікае ўражаньне, што час затрымаўся на мейсцы. Партрэты Леніна па-ранейшаму аздабляюць сьцены залы. Старая таблічка ля стала новага дырэктара нагадвае пра заслугі школы ў акцыі "Антыімпэрыялістычная салідарнасьць".

Большасьць настаўнікаў былі членамі камуністычнае партыі. Таму, на думку спэцыялістаў па справах адукацыі, увядзеньне адзінай ва ўсёй Нямеччыне сыстэмы адукацыі можа зацягнуцца нават на дзесяць гадоў.

Былое ўсходне-нямецкае выдавецтва "Людзі і Веды" здолела адрэдагаваць зьмест 63-х з 540 школьных падручнікаў. Першая кніга "Наш лемантар" стала "Маім лемантаром", у якім замест ранейшых сьцягоў ГДР на старонаках для расфарбоўкі зьмешчаныя дамы і кветкі. Расейская мова перастае быць абавязковым прадметам. Большасьць вучняў (90 прац.) выбірае ангельскую мову.

Цяжэй зь гісторыяй. Старыя падручнікі інтэрпрэтуюць падзеі ў ГДР, як марш ідэальнага сацыялістычнага грамадзтва. Некаторым настаўнікам цяжка пагадзіцца, што гэты вобраз аказаўся фікцыяй. Гады сацыялістычнага выхаваньня зрабілі сваё.

## НОВЫ САКРАТАР ПАРТЫІ

Новым сакратаром партыі быў абраны шасьцідзесяцігадовы Марцін Борман. Калегі кажуць пра партайгеноса Бормана: "моцная лічнасьць". Гэта значыць, што ідэалы сацыялізму цяпер будуць праводзіцца ў жыцьцё яшчэ больш настойліва і тупа.



**Дакладную інфармацыю пра дзейнасьць палітычнае апазіцыі на Беларусі; узважаныя думкі прадстаўнікоў гэтай апазіцыі —эканамістаў, сацыёлягаў, культуролягаў; дасьведчаны погляд у мінуўшчыну і будучыню нашае Бацькаўшчыны, а таксама шмат чаго іншага Вы знойдзеце на старонках газэты "НАВІНЫ БНФ"**

## ЧЭСЛАЎ МІЛАШ ТАКСАМА БЕЛАРУС

**Як паведаміў тыднёвік "НіВА",у адным інтэрвію з братам Чэслава Мілаша Андрэем Мілашам, на пытаньне зьвязанае з нацыянальнасьцю нобелеўскага ляўрэата,ягоны брат адказаў:"Мілашы—гэта такія самыя ліцьвіны, як Міцкевіч, Гамбровіч, Голубеў, Ясеніца,Ванькові, Віткацы ці нават Пілсудзкі.Чэслаў гаворыць пра сабе—я ліцьвін польскай культуры".**

## ПАЧАЛІ З ЭНГЕЛЬСА

**Зьвяртаюся да Вас наконт таго, каб наступныя нумары газэты СВАБОДА дасылалі мне на вуліцу Міхася Явара, 13. Гэта зьвязана з тым, што на сэсіі сельсавету вуліцу Энгельса перайменавалі на вуліцу імя М.Явара.**

**Ул.ПРЫЦЬКО,**
**Гарадзенская вобласьць**
**Мастоўскі раён**
**в. Лупа**

Зьявіўся першы нумар газэты "Беларускі калекцыянэр".Тэмы публікацыяў:маркі Слуцкага паўстаньня,425-я ўгодкі беларускае пошты,калекцыі беларусыкі на Захадзе ды інш.Зьмешчаны перадрук прэйскуранту,па якім савецкія ордэны й медалі прадаюцца на чорным рынку. Напрыклад,ордэн Леніна каштуе 3 тыс. рублёў,а Дружбы народаў—200.Самы дарагі,ордэн Ушакова І ступені—7 тыс. рублёў,а самы танны—"Мацярынская Слава" III ступені—усяго 30 рублёў...

Набыць "Беларускага калекцыянэра" падпісчыкі СВАБОДЫ могуць праз нашу рэдакцыю,даслаўшы замову.

**Выданьне падрыхтавалі А.Гуркоў, С.Дубавец, П.Жук, В.Корзун, А.Лапцёнак, С.Харэўскі. Фатаграфічныя работы С.Грыца і А.Крыштап**

## КАМУ ПАТРЭБНЫ РАСКОЛ У БНФ?

Пры ўтварэнні групаў падтрымкі БНФ ніякіх абмежаваньняў па партыйнасьці, веравызначэньні й па іншых атрыбутах не было. Акрамя адной: партыйцы, якія займаюць вызваленыя пасады ў выбарных партыйных органах, ня могуць займаць кіраўнічыя пасады ў БНФ. У сувязі з такой дэмакратычнай асноваю ўтварэньня нізавых арганізацыяў БНФ многія камуністы ўступілі ў Народны Фронт. А цяпер у Фронце пачалася антыкамуністычная істэрыя. На нядаўняй кафэрэнцыі БНФ нам, камуністам, якія працуюць у БНФ, прапанавана выйсьці з партыі (гл. адну з рэзалюцыяў). Узьнікае пытаньне: чаму такая прапанова не была зробленая ў адносінах да членаў іншых партыяў? Чаму падвойнае членства для прадстаўнікоў іншых партыяў не зьяўляецца перашкодай?..

З дакладу мандатнай камісіі канфэрэнцыі БНФ вядома, што сярод дэлегатаў было (лічбы прыводжу па памяці) 23 члены КПСС, 7 камсамольцаў, 17 членаў нацыянальна-дэмакратычнае партыі. У сваім выступленні А. Сідарэвіч назваў сябе незалежным сацыял-дэмакратам. Члены некаторых новых партыяў, як мне вядома, па нейкіх прычынах схавалі сваю партыйную прыналежнасць. А ўвесь агонь на каферэнцыі быў засяроджаны на нас, камуністах, якія працуюць у БНФ.

Дэмакратычна настроеныя камуністы, якія ў свой час увайшлі ў БНФ, апынуліся паміж двух вагнёў: з аднаго боку нас б'юць партапаратчыкі і камуністы-пурытане за прыналежнасьць да БНФ, з другога боку – нас дзяўбуць у БНФ за прыналежнасьць да партыі камуністаў. У сувязі з гэтым прыток камуністаў-дэмакратаў у БНФ спыніўся. Хто ж захоча быць пад падвойным вагнём?..

Антыкамуністычныя настроі ў БНФ нарастаюць. Пра гэта сьведчыць артыкул А. Чобата "Разьвітаньне зь "лепшымі сіламі", які зьмешчаны ў 9–10 нумары СВАБОДЫ.

Усё ідзе да таго, што на 2-м зьезьдзе БНФ будзе прынятае рашэньне выключыць нас, камуністаў, з БНФ. Мы ад гэтага мала што страцім. Шмат што страціць БНФ. Гэтае мерапрыемства аслабіць БНФ і прывядзе да ўтварэньня Другога фронту, да расколу...

Партыя бальшавікоў (камуністаў) Беларусі з моманту свайго ўтварэньня мела антынацыянальнае мясьнікянска-кнорынскае крыло і нацыянальна-дэмакратычнае крыло Жылуновіча-Чарвякова-Дылы, да якога я сябе прылічваю. Мясьнікянска-кнорынскае крыло на працягу дзесяцігодзьдзяў было пры ўладзе, і яно адказнае за Курапаты. Крыло камуністаў Беларусі Жылуновіча-Чарвякова-Дылы за злачынствы кнорынцаў-мясьнікянцаў адказнасьці не нясе. Як бачым, сярод беларускіх камуністаў былі і ёсьць тыя, хто расстрэльваў, і тыя, каго расстрэльвалі. І ня трэба ўсё зьмешваць у вадну кучу.

Гэта трэба памятаць ня толькі лідарам БНФ, але і членам БНФ, для якіх усе камуністы Беларусі здаюцца аднолькавымі...

Што датычыць заклiку да выхаду нас з партыі і да пакаяньня, то яны проста несур'ёзныя. Нам няма ў чым каяцца. Гэтыя заклікі падобныя на тое, каб мы камуністы, заклікалі католікаў парваць са сваёй верай, бо ў свой час католікі ўваходзілі ў суды інквізіцыі.

І апошняе. БНФ – ня партыя, а грамадзка-палітычная арганізацыя, якая аб'ядноўвае прадстаўнікоў розных партый і поглядаў. Мы, камуністы з БНФ, паважаем погляды хрысьціянскіх дэмакратаў, нацыянальных дэмакратаў і погляды прадстаўнікоў іншых партый і беспартыйных. Просім і іх паважаць нашыя погляды, бо, як кажа прымаўка, як гукнеш, так адгукнецца.

Каму патрэбны раскол у БНФ?.. Я заклікаю да адзінства і згуртаванасьці ўсе прагрэсіўныя сілы БНФ, партыі і народа.

**Рыгор РОДЧАНКА,**
член Рады Беларускага краязнаўчага таварыства, член Рады БНФ Случчыны, старшыня Саюзу юных удзельнікаў Вялікай Айчынай вайны, член КПСС, партызан Беларусі.




Споўнілася 100 гадоў з дня, калі нарадзіўся беларускі паэт




## ШТО ЯНКА-ВАЯКА КАЗАЎ

*АПАВЯДАНЬНЕ*

—Што чуваць?

—Эт, нічога.Вось Янка з вайны вярнуўся.Дзе ён ня быў, хай Бог бароніць.Француз, кажа , найразумнейшы.Там нават малыя дзеткі па-французку балбочуць,а багаты аж страх:нават старыя бабы ў капелюшох ходзяць.

Ангельцы дык найбольш памаўчаць любяць,а калі што гавораць,усё вусны складаюць,усёроўна якбы плюнуць маніліся. Італьцы-народ гарачы, чорны, як цыганы.Зусім стыду ня маюць,а ні ўстаіць на мейсцы,якбы рабакі меў.Туркі—народ бабскі,бабы іх сапсулі,бо маюць па дзьве і больш...нават самі спаднiцы носяць,хоць вусы людзкія маюць.Грэкі –хітруны.Грэк і жыда зманіць, а махляр—ні дай ты Божа!..Чэх—таксама спрытны.Кажуць,што як Калумб прыехаў у Амэрыку, спаткалі яго чэхі і кажуць:''Мы сэм тады''...

Славянец—чысты і бойкі, толькі гаворыць быццам бобу аб'еўся.Немцы—старыя лгуны.Народ разумны,толькі горды, як люцыпар, а замест сэрца носіць у грудзях гной.Палякі—паны вялікія.У іх так яшчэ ў калысцы ў портачках ходзяць.Украінцы—нічога людзі, толькі сьмешныя...хахлы, а як хто ня верыць,што яны украінцы, дык проста ў зубы б'юць. Літвіны—ніштo сабе.Але як заэлуе, то не даруе.

Расейцы—гэта малы народ ды вялікіх інтарэсаў...

—Ну а мы,што Янка пра нас казаў?

—А чорт яго ведае—не пытаўся.

1919 г.

овіча.Ліцэнзія №10.Афсэтны друк.Друкарня МАУД.Зак. 2911 Наклад 40000 асобнікаў.